

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 5 (190) 25 лістапада 1992 г.

## Кіраванне і бізнес

### *СЕМІНАР НА ТАКУЮ ТЭМУ ПРАЙШОЎ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ*



Праводзіўся ён у адпаведнасці з шматмэтавай, доўгатэрміновай праграмай падрыхтоўкі кіраўніцкіх кадраў для сферы прадпрыймальніцтва, бізнесу і фінансаў, для дзяржаўных і іншых прадпрыемстваў і ўстаноў. Цікавасць да такога мерапрыемства была вялікай таму, што арганізатарамі яго, акрамя нашага універсітэта, былі Міжнародны камітэт малога бізнесу з Чыкага і Цэнтр развіцця прадпрыймальніцтва са Злучаных Штатаў Амерыкі. Амерыканскія вучоныя прыехалі да нас, каб выступіць з лекцыямі па прадпрыймальніцтву і па арганізацыі бізнесу, заключыць пагадненне аб супрацоўніцтве.

У рабоце семінара прынялі ўдзел прадпрыймальнікі з Гродна, Смаргоні, Ашмян, Шчучына, прадстаўнікі камерцыйных і біржавых структур, усе тыя, хто пажадаў заняцца малым бізнесам.

Адкрыў семінар уступным словам рэктар універсітэта прафесар А. В. БАДАКОЎ.

З дакладам «Стратэгія планавання ў бізнесе» выступіў прэзідэнт Цэнтра развіцця прадпрыймальніцтва (Чыкага, ЗША) прафесар РЭНДЗІ РОЛІНСАН. Прэзідэнт Міжнароднага камітэта малога бізнесу, прафесар універсітэта ў г. Дайтон ЮДЖЫН ГАМОЛКА зрабіў даклад на тэму «Кіраванне ў малым бізнесе». Навукоўцы са Злучаных Штатаў адказалі на пытанні прысутных, далі неабходныя кансультацыі, як стаць прадпрыймальнікам, што неабходна для таго, каб выжыць ва ўмовах рынка.

Пасля семінара адбылося падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж навуковымі ўстановамі ЗША і Гродзенскім універсітэтам. З нашага боку пагадненне падпісаў рэктар А. В. Бадакоў.

Тэкст пагаднення змешчаны на 2-й старонцы.

**Л. ЯРУНЦАВА.**

**На здымках: Р. Ролінсан (злева) і Ю. Гамолка. (Для чытачоў «Гродзенскага універсітэта» Ю. Гамолка пакінуў запіс: З найлепшымі пажаданнямі ў арганізацыі бізнесу ў Гродне); амерыканскія навукоўцы з кіраўнікамі універсітэта.**

**Фота У. САРОКІНА.**

Best wishes on the establishment of a School of Business in Grodno.
Eugene Gamolka



## З чым пачынаем навучальны год

Планаванне вучэбна-метадычнай работы, метадычная забяспечанасць чытаемых курсаў — важная састаўная частка вучэбна-выхаваўчага працэсу. Таму вучэбна-метадычным аддзелам была прааналізавана работа кафедр у гэтым накірунку.

Трэба адзначыць, што на большасці кафедр (а іх праверана 11) метадычная работа плануецца сістэматычна, выкладчыкі маюць індывідуальныя планы і рабочыя праграмы па чытаемых курсах і спецкурсах, якія своечасова былі зацверджаны. Некаторыя з іх працуюць па сваіх асабістых вучэбна-метадычных комплексах і метадычных распрацоўках.

Многія выкладчыкі, улічваючы недахоп літаратуры і метадычнага забеспячэння чытаемых курсаў, займаюцца падрыхтоўкай вучэбных дапаможнікаў, тэкстаў лекцый, планаў практычных заняткаў, тэматык кантрольных работ і інш.

На кафедры рускай мовы (загадчык прафесар Канюшкевіч М. І.) сёлета праведзены і абмеркаваны чатыры адкрытыя лекцыі. Многія выкладчыкі засвоілі распрацоўкі і выкарыстанне вучэбна-кантрольных праграм па сваіх дысцыплінах ў дысплейных класах. На кафедры педагогікі (загадчык прафесар Таранцей В. П.) распрацоўваецца новы варыянт вучэбных рабочых праграм, а таксама лекцый на беларускай мове. Гэтая кафедра набывае шмат метадычнай літаратуры па-за межамі Беларусі. На кафедры гісторыі Беларусі (загадчык прафесар Крэнь І. П.) ужо трэці год працуе метадалагічны семінар. Выкладчыкі даюць адкрытыя лекцыі, абмяркоўваюць тэксты лекцый, выступаюць з рэфератамі па актуальных праблемах гісторыі Беларусі.

У той жа час стан метадычнай работы на большасці кафедр не можа не выклікаць занепакоенасці і патрабуе неадкладнага прыняцця мер. Так, у гэтым годзе неапраўдана зацягнулася зацвярджэнне на шэрагу кафедр рабочых праграм і індывідуальных планаў. Яны зацвярджаліся нават у лістападзе, хаця зрабіць гэта трэба ў пачатку навучальнага года. Некаторыя выкладчыкі фармальна падыйшлі да індывідуальных планаў, пераклалі іх запаўненне на лабарантаў.

Выклікае занепакоенасць той факт, што на факультэтах уводзяцца новыя курсы, спецкурсы і спецсемінары, але яны практычна не забяспечаны ні праграмамі, ні літаратурай, ні метадычнымі дапаможнікамі. Можна сабе ўявіць, у якую сітуацыю пападаюць як студэнты, так і выкладчыкі.

Так, на пасяджэнні кафедры дзяржаўнага, працоўнага і сельскагаспадарчага права 27 кастрычніка разглядаліся рабочыя праграмы спецкурсаў і чытаемых дысцыплін і было прынята рашэнне да 20 лістапада абнавіць іх з улікам новага заканадаўства і распрацаваць вучэбныя праграмы спецкурсаў. Чытаецца 12 спецкурсаў, сярод якіх «Асновы валютнага права», «Асновы банкаўскага права» і інш. Кафедрай грамадзянскага права і працэсу ўведзены новы курс «Зямельнае права», але ён не забяспечаны метадычнай літаратурай.

Дарэчы, адсутнасць неабходных падручнікаў, метадычных распрацовак вельмі востра адчуваецца і на іншых кафедрах і факультэтах. Не хапае вучэбных дапаможнікаў «Сучасная беларуская мова. Лексікалогія. Фразеалогія. Фанетыка. Графіка. Арфаграфія» для студэнтаў першага курса філфака. Недастаткова метадычнай літаратуры да курсаў «Беларуская дыялекталогія», «Лацінская мова», «Нямецкая мова», «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы», «Агульнае мовазнаўства», падручнікаў па агульнай псіхалогіі і педагагічнай псіхалогіі і іншых. Па некаторых тэмах выкладчыкі самі рыхтуюць падручнікі і яны хутка выйдуць у нашым выдавецтве. Але, на жаль, па многіх курсах выданне вучэбнай літаратуры не прадугледжана.

Відавочна, кафедрам трэба больш патрабавальна падыходзіць да планавання вучэбна-метадычнай работы як у цэлым, так і кожным выкладчыкам, ажыццяўляць пастаянны кантроль за распрацоўкай і выкарыстаннем рабочых праграм і індывідуальных планаў. Метадычнае забеспячэнне чытаемых курсаў павінна весціся больш мэтанакіравана.

**Я. КАНДРАТОВІЧ,**
**метадыст вучэбна-метадычнага аддзела.**

## На актуальную тэму

На пашыраным пасяджэнні прафкама супрацоўнікаў і адміністрацыі універсітэта разгледжана пытанне аб сумесных дзеяннях па сацыяльнай абароне выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Заслухана інфармацыя старшыні прафкама В. А. Хілюты і прарэктара В. П. Таранцея аб прымаемых мерах у гэтым накірунку.

Рэкамендавана дэканам, кіраўнікам кафедр, аддзелаў і служб, старшыням прафбюро і прафгрупоргам абмеркаваць да 25 снежня на сходах сітуацыю ў сістэме адукацыі і навукі ў сувязі з невыкананнем урадам у поўным аб'ёме артыкула 34 Закона аб адукацыі.

Вырашана склікаць у студзені-лютым 1993 года агульнауніверсітэцкую прафсаюзную канферэнцыю, прысвечаную абароне сацыяльных правоў супрацоўнікаў універсітэта.

На канферэнцыю будзе выбірацца адзін дэлегат ад трох супрацоўнікаў.

(Матэрыял аб сумесных дзеяннях прафкама і адміністрацыі па забеспячэнню сацыяльнай абароны супрацоўнікаў будзе змешчаны ў наступным нумары газеты).

**У. ПАЎЛЕНКА.**

# Пагадненне аб супрацоўніцтве

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы ў асобе рэктара Бадакова Аляксандра Васільевіча, з аднаго боку, і Міжнародны камітэт малога бізнесу (ЗША) у асобе выбарнага прэзідэнта Яўгенія Г. Гамолкі, Цэнтр развіцця прадпрыймальніцтва (ЗША) у асобе прэзідэнта Рэндзі Ролінсана, з другога боку, выказваюць волю да супрацоўніцтва і ў гэтых мэтах пагадзіліся ажыццявіць мерапрыемствы па наступных накірунках сумеснай дзейнасці:

— арганізацыя сістэмы падрыхтоўкі кадраў для сферы бізнесу і кіравання ў наступных формах: а) завочнага факультэта менеджмента на камерцыйнай аснове для асоб, якія маюць базавую вышэйшую адукацыю з паўтарагадовым тэрмінам навучання і аналагічнага факультэта з паўтарагадовым тэрмінам навучання і аналагічнага факультэта для моладзі, якая мае сярэднюю адукацыю, пасля заканчэння якога будзе выдавацца дыплом магістра ўстаноўленага ўзору; б) вышэйшай камерцыйнай школы бізнесу на акцыянернай аснове з філіяламі ў абласных цэнтрах Рэспублікі Беларусь. Вучоба ў вышэйназваных структурах адукацыі платная, аплата праводзіцца як у доларах ЗША, так і мясцовай валюце;

— правядзенне з 1993 года навуковымі сіламі Міжнароднага камітэта малога бізнесу і Цэнтра развіцця прадпрыймальніцтва семінараў з выкладчыкамі Школы бізнесу універсітэта;

— стварэнне інфармацыйнай базы для бізнес-адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

— кансультатыўна-метадычную дапамогу з боку Міжнароднага камітэта малога бізнесу і Цэнтра развіцця прадпрыймальніцтва педагагічным кадрам, занятых у бізнес-адукацыі;

— правядзенне стажыровак і практык студэнтаў і слухачоў на прадпрыемствах вучэбных бізнес-цэнтраў і вышэйшых навучальных устаноў Еўропы і, магчыма, ЗША;

— стварэнне сумесных прадпрыемстваў, устаноў;

— арганізацыя канферэнцый, сімпозіумаў і семінараў;

— абмен супрацоўнікамі;

— сумесная арганізацыя сустрэч прадстаўнікоў бізнесу ЗША і Рэспублікі Беларусь;

— абмен вопытам, матэрыяламі і інфармацыяй;

— сумесная выдавецкая дзейнасць.

Бакі дамовіліся аб тым, што працягнуць намаганні па рашэнню пытання аб фінансаванні сумесных мерапрыемстваў і заключаць пазней, прыблізна ў сакавіку 1993 года, з гэтай нагоды дадатковае пагадненне.

**Рэктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы**

**А. В. БАДАКОЎ.**

**Прэзідэнт Цэнтра развіцця прадпрыймальніцтва**

**Р. РОЛІНСАН.**

**Прэзідэнт Міжнароднага камітэта малога бізнесу**

**Е. Г. ГАМОЛКА.**

**Гродна, 16 лістапада 1992 года.**



**На здымку: у час падпісання пагаднення.**

**Фота У. САРОКІНА.**

# Дысцыпліна. Як яна выконваецца?

Як вядома, у нашым універсітэце створана інспектарская група на чале з прарэктарам М. В. Васілючакам. Нядаўна яна праверыла стан выхаваўчай дысцыпліны на большасці факультэтаў і шэрагу кафедр. Вынікі гэтай праверкі разгледжаны на апошнім пасяджэнні рэктарата.

Трэба адзначыць, што ў цэлым пастановы ўрада, Вучонай рады, загады рэктара выконваюцца. На кафедрах і факультэтах праводзіцца адпаведная работа па паляпшэнню якасці навучання, укараненню перадавога вопыту і новых тэхналогій. У той жа час стан працоўнай дысцыпліны жадае быць лепшым. Узяць, напрыклад, кафедры фізічнага выхавання, тэорыі і методыкі фізічнай культуры і дэканат факультэта фізічнай культуры. Факультэт рыхтуе спецыялістаў па 6 навучальных праграмах, што стварае пэўныя цяжкасці ў рабоце. Кафедры працуюць не па дзяржаўных праграмах, бо яны ўстарэлі, а па ўласных. Але гэтых праграм у дэканаце няма, яны знаходзяцца ў выкладчыкаў. Вучэбныя планы хаця і абмеркаваны на радзе факультэта, але яны не размножаны, не даведзены да выкладчыкаў. Што датычыць рабочых праграм, то яны знаходзіліся пад час праверкі на дапрацоўцы. На жаль, не ў пашане на гэтых кафедрах беларуская мова, справаводства на ёй не вядзецца. Дэканат паабяцаў ухіліць недахопы ў бліжэйш[...] час.

Ёсць недахопы і інша[...] характару. Так, на біял[...]гічным факультэце пры пер[...]водзе студэнта дзённага ад[...]дзялення І. Захарчука н[...] шосты курс завочнага аддзя[...]лення за папярэднія гад[...] навучання заліковая кніжк[...] не была афармлена: адсутн[...]чалі запісы дэкана аб пера[...]водзе з курса на курс, а[...] допуску да экзаменацыйна[...] сесіі. На факультэце бела[...]рускай філалогіі і культур[...] была спроба студэнткі шос[...]тага курса завочнага аддзялення прайсці педагагічную практыку ў г. Краснадары. Цяпер яна праходзіць практыку ў школе № 19 г. Гродна.

Пад час праверкі наведваліся таксама інтэрнаты № 1 [...] № 2. Выяўлена, што не ўсё ў парадку з выхаваўчай работай па месцы жыхарства студэнтаў. Так, выхавацелі чамусьці працуюць днём, калі студэнты на занятках, а пазней 10 гадзін вечара іх там няма. Інспектарская група лічыць, што выхавацелі павінны працаваць з 17 ці 18 гадзін да 24. Вельмі слаба працуюць студэнцкія саветы, рэдка наведваюць інтэрнаты выкладчыкі. Наогул, студэнтам, якія жывуць у інтэрнатах, трэба надаваць больш увагі, разнастаіць выхаваўчую работу з імі.

Па выніках праверкі выдадзены адпаведны загад рэктара па паляпшэнню выканаўчай дысцыпліны ва універсітэце.

**В. ПАЎЛАЎ.**

*Пагаворым шчыра*

# Цяпер правадыроў у нас шмат...

Вы ніколі не задумваліся над тым, чаму амерыканцы аднолькава з павагай адносяцца да ўсіх сваіх прэзідэнтаў (а іх за працяглы час гісторыі Злучаных Штатаў было нямала) — ад Аўраама Лінкольна і Джоржа Вашынгтона да Джоржа Буша і Біла Клінтана? Сапраўды, нельга сказаць, што іх ніколі і ні за што не крытыкавалі. Усялякае бывала... Некаторых з іх нават забівалі... Дастаткова ўспомніць хоць бы тых жа Лінкольна ці Джона Кенедзі...

Я вяду размову пра другое: пра адносіны да амерыканскіх прэзідэнтаў пасля таго, калі яны пакінулі актыўную палітыку, а потым і жыццё.

Амерыканская гісторыя не ведае крыклівых кампаній па звяржэнню і развянчанню неіснуючых «ідалаў». Кожны з прэзідэнтаў заняў у ёй сваё месца. Так, Гары Трумэн скінуў атамныя бомбы на Хірасіму і Нагасакі... Так, Джон Кенедзі ўцягнуў Штаты ў в´етнамскую авантуру... Так, Рычард Ніксан замешаны ва ўотэргейцкім скандале... Але ўсе яны заставаліся ў гісторыі Прэзідэнтамі Вялікай Дзяржавы, і іх гонар і годнасць — без замераў сучасных палітыкаў.

У айчыннай гісторыі ўсё па-іншаму...

Бадай, ні ў адной другой дзяржаве не было столькі «цароў-ідалаў», якія былі затаптаны ў гразь сваімі ж «нашчадкамі» і праклятыя сваім жа народам, як у нас. Асабліва характэрным гэта стала ў савецкі перыяд. Ні адзін з правадыроў першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян, пачынаючы з Леніна, не пайшоў у палітычнае небыццё «па-добраму». Прычым, характэрна тое, што калі пры жыцці яны былі ўзнесены да нябёс, то аплёванымі і абсвістанымі яны аказаліся, сыйшоўшы ў магілу, да таго ж і з салідная часовай вытрымкай. Калі за Леаніда Ільіча ці Іосіфа Вісарыёнавіча ўзяліся праз некалькі гадоў пасля таго, як пайшлі ў свет іншы, то да «перагляду» дзейнасці Уладзіміра Ільіча прыступілі аж праз шэсць дзесяцігоддзяў пасля яго смерці.

Цікава, што наколькі небяспечнай і нават крымінальнай карай была ў нас крытыка правадыроў пры іх жыцці, настолькі яна бяспечна і без пакарання пасля іх смерці. А топчам мы «ідалаў» сваіх, трэба сказаць шчыра, з нейкай хваравітай, па-халопску істэрычнай асалодай. Магчыма, гэтым недастойным цывілізаванага чалавека спосабам мы помсцім за дзесяцігоддзі страху і знявагі?

Калі акінуць разумовым поглядам айчынную гісторыю, то непазбежна можна прыйсці да выніку: ва ўсе стагоддзі народ наш больш спадзяваўся на разумнага, добрага і моцнага «бацюхну-цара», чым на свае ўласныя сілы. «Вось прыедзе пан, пан і вырашыць» — з гэтай рабскай ідэалогіяй, з пакутай з´яўляліся на белы свет і з пакутай жа яго пакідалі многія пакаленні нашых продкаў. Вольнадумцы і паўстанцы, якія, як яркія каметы, праносіліся па небасхіле нашай гісторыі, былі выключэннем і толькі пацвярджалі ўсеагульнае векавое правіла. Да таго ж не грэх успомніць, што хтосьці з іх спрабаваў падняць народ супраць «цара-ірада», выдаючы сябе за... Вось іменна, таксама за цара, толькі пакрыўджанага сваімі папярэднікамі. Людзі свята верылі ў тое, што замест «злоснага цара» можа прыйсці «цар добры», які накорміць і напоіць іх, дасць ім волю.

Калі думаеш пра гэта, то міжвольна прыходзіць думка, што на такіх пачуццях умела сыгралі ў свой час бальшавікі, паабяцаўшы народу мір, зямлю і волю...

Мір, на жаль, не атрымаўся, бо здарылася самае страшнае, што магло атрымацца на крутым пераломе гісторыі: брат паўстаў супраць брата, сын узняўся на бацьку... Гэтую братазабойную вайну мы пасля назвалі грамадзянскай...

Нядоўга араты радаваўся і зямлі. Прайшло ўсяго дзесяць год — і зямлю ў сялян адабралі, усіх пагалоўна загналі ў калгасы, дзе «праца на сябе» стала чарговай дэмагагічнай фікцыяй. Аб´ядноўвалі, як аказалася потым, каб лепш было адбіраць хлеб для напаўнення «закромов Родины».

З воляй і наогул пажартавалі, бо ў хуткім часе краіна ператварылася ў адзін магутны лагер, а народ стаў... «ворагам народа», які жорстка знішчаўся...

Самае страшнае тое, што і каля гулагаўскай магілы народ у сваёй большасці слепа верыў у «правадыра-ірада», і калі новы «цар» асмеліўся ў 56-м сказаць пра былога цара ўсяго толькі малую долю праўды, то многія не паверылі...

Таму калі «валюнтарыста» змяніў на «троне» «дарагі і любімы», то яго дзеянні па «ціхай» рэабілітацыі Сталіна большасцю былі сустрэты з маўклівым адабрэннем.

Затое Хрушчову дасталася... Яго лёс трагічны ўжо таму, што ад улады яго вызвалілі яшчэ пры жыцці. Ён, бадай, быў першы сярод «цароў», хто з крамлёўскага кабінета адпраўляўся не да Крамлёўскай сцяны, а на ціхую падмаскоўскую дачу. Шлях яго «из князя — в грязи» быў горкі і журботны...

Гады «вялікіх пахаванняў» нечакана для многіх вывелі на вяршыню ўлады мала каму вядомага «маладога цара»... Пры ім блага прыйшлося ўсім «вялікім». Іменна за час яго «праўлення» пачаўся «перагляд» Леніна, і мы былі літаральна шакіраваны, калі давялося, што... Уладзімір Ільіч памыляўся, і нават часта. Справа дайшла да разбурэння манументаў і змены назваў гарадоў і вуліц... Цкаванне «вялікага нябожчыка» прыняло такія грандыёзныя маштабы, што вызвала непаразуменне нават у тых на Захадзе, хто ўсё жыццё змагаўся з ідэямі марксізму-ленінізму.

Пра Сталіна і гаварыць не прыходзіцца... Выступаць у прэсе ці з трыбуны і не пнуць «правадыра народаў» лічылася дурным тонам... Нам дазволілі стаць смелымі — і мы ахвотна сталі імі...

І наогул, крытыкаваць «вялікіх мерцвякоў» стала справай выгаднай і нават прыбытковай: для пісьменнікаў і журналістаў — у сэнсе ганараў, для дзяржаўных кіраўнікоў — у сэнсе палітычнага капіталу. А галоўнае — усё гэта зусім бяспечна для жыцця і здароўя.

Брэжнеў, Чарненка... Здзекаваліся з іх з размахам, са смакам, з садысцкай нейкай асалодай. Андропаў не атрымаў «па заслугах», падобна, толькі таму, што набыць гэтых «заслуг» проста не паспеў з прычыны вельмі непрацяглага знаходжання на «троне».

Бясспрэчна: усе тыя, хто «кіраваў» намі на працягу «савецкага перыяду» нашай гісторыі,— асобы ў многім адыёзныя, да «станоўчых герояў» аднесці іх наўрад ці можна, нават з улікам таго добрага, што яны, калі быць справядлівымі, зрабілі (Сталін — разгром фашызму, Хрушчоў — выкрыццё культу асобы, Брэжнеў — заключэнне Хельсінскага дакумента...). Ушанаваць па заслугах кожнага з іх — справа святая. Хоць гэта гучыць вельмі эмацыянальна. Лепш сказаць — даць аб´ектыўную палітычную ацэнку.

Так і хочацца сказаць пра гэтую вакханалію словамі аднаго літаратурнага героя, таксама звергнутага «цара», толькі, калі можна сказаць, мясцовага маштабу: «З каго смеяцеся? З сябе смеяцеся!..»

Дык гэта ж па нашых галовах і спінах узбіраліся гэтыя «цары» на свае п´едэсталы. Пад нашыя «бурныя, працяглыя апладысменты, якія пераходзілі у авацыі», вяршылі яны абсурдную палітыку. Яна і прывяла нас на край прорвы. А мы? Мы маўчалі, і на лепшы выпадак шэптам расказвалі на кухні жонцы анекдоты пра Мікіту...

Цяпер, атрымаўшы ад начальства «дабро» на плюралізм, мы, замест удумлівага аналізу свайго, бясспрэчна, горкага мінулага, звальваем усё на «дрэнных цароў», якія недарэчна кіравалі намі.

Але ж мы таксама добрыя! Нездарма сказана, што ўсялякі народ мае такіх правадыроў, якіх ён дастойны...

Ох, і не зайздрошчу Гарбачову!.. Адхіліў яго «ад руля» Барыс Мікалаевіч, безумоўна, з бачнай цывілізаванасцю, але што будзе далей? Як праявяць сябе новыя «опричники»?

Цяпер правадыроў у нас шмат... Ці ўсе яны вытрымаюць выпрабаванне ўладай? Ці для Сенькі будзе «царская» шапка? Каго мы будзем «клеймаваць ганьбой» гадоў так праз трычатыры?

**У. ЯГОРЫЧАЎ,**

**кандыдат гістарычных навук.**

# Спярша трэба стаць беларусам...

(Працяг. Пачатак на 3-й стар.)

нягледзячы на афіцыйную забарону, на маральны ўціск. Згодна з дадзенымі перапісу 1987 года, амаль 44 працэнты насельніцтва Гродзенскай губерні назвалі беларускую мову роднай. У Слонімскім уездзе 81 працэнт, у Ваўкавыскім — 80, у Гродзенскім — 68.

Гартаю другі том дадзеных ўсесаюзнага перапісу насельніцтва 1989 года па Гродзенскай вобласці. Амаль 85 працэнтаў беларусаў назвалі беларускую мову роднай (а на сяле амаль 98 працэнтаў). А яшчэ 187 тысяч палякаў, болей 5 тысяч рускіх, больш за 2 тысячы ўкраінцаў, больш за тысячу татар, кожны шосты з літоўцаў, якія жывуць на Гродзеншчыне.

* * *

Здавалася б, Закон «Аб мовах у Беларускай ССР» карэнным чынам зменіць адносіны да беларускай мовы і ў параўнаўча кароткі тэрмін забяспечыць яе статус у дзяржаўных і грамадскіх арганізацыях, ва ўсіх тыпах навучальных установ, у сродках масавай інфармацыі, у грамадска-палітычнай і навуковай літаратуры.

Будзем рэалістамі. Нічога падобнага не назіраецца. Больш таго. Кароткі перыяд мітынговай «бури и натиска» ў абарону роднай мовы паціху трансфармоўваўся ў паўзучую стагнацыю, а ў апошнія месяцы кімсьці добраспланаваны «крыжовы паход» супраць дзяржаўнасці беларускай мовы.

Скажаце, перабольшваю. Хацеў бы спадзявацца, ды сённяшняя рэчаіснасць не дае падстаў. Як слушна падкрэслівае Леанід Лян у артыкуле «Калі ж на ўсю моц загучыць роднае слова» (глядзі «Народную газету» ад 29 кастрычніка 1992 года). Не існуе асаблівай цяжкасці напаткаць у нашых газетах матэрыялы ці пачуць па радыё выказванні, у якіх наўмысна фальсіфікуецца гісторыя нашай роднай Бацькаўшчыны, ганьбіцца беларуская мова, ставіцца пад сумненне мэтазгоднасць абвяшчэння Беларусі суверэннай дзяржавай. Дадайце да гэтага галасы народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь, рэзалюцыі некаторых мітынгаў, якія, дарэчы, праводзіліся ў сталіцы незалежнай дзяржавы, дапасуйце да гэтага разважанні некаторых лідэраў нацыянальна-культурных аб'яднанняў, якія ставяць пытанне ў плоскасць «або двухмоўе, або Прыднястроўе», і ўбачыце, што не перабольшваю.

Згодзен. Пры жаданні ўсё гэта можна кваліфікаваць як праявы экстрамізму, які, маўляў, не мае і не можа мець грунтоўнасць глебы на Беларусі. На жаль, мае. Гэтай глебай выступае псіхалогія, згодна якой адраджэнне роднай мовы — гэта шлях да інтэлектуальнай і культурнай самаізаляцыі беларусаў. Згодна з гэтай псіхалогіяй, беларусізацыя сярэдняй і вышэйшай школы, навукі і культуры немінуча прывядзе да таго, што Беларусь апынецца ў баку ад сусветнага інтэлектуальнага і культурнага працэсу, паколькі будуць парушаны традыцыйныя зносіны з другімі нацыямі былога Савецкага Саюза і ў першую чаргу з рускай нацыяй.

Людзі, якія падзяляюць гэтую псіхалогію, не ўлічваюць таго, што нацыям, перш чым наладжваць зносіны паміж сабою, трэба стаць нацыямі. Гэта значыць адрадзіць свой лад жыцця, сваю мову, сваю культуру, свой нацыянальны гонар, свае лепшыя нацыянальныя якасці. Апошняе ў поўным сэнсе адносіцца і да кожнага чалавека. Спярша трэба стаць беларусам, рускім, літоўцам, палякам, украінцам і толькі пасля гэтага па неабходнасці ўступаць у зносіны з прадстаўнікамі іншых нацый. Бо для чалавека натуральна жыць пад аховай свайго народу, карыстацца інтэлектуальным і маральным багаццем, якое назапасілі вякамі яго продкі. Калі зносіны паміж людзьмі становяцца дэнацыяналізаванымі — гэта штучныя, гэта хворыя зносіны. А з рэшты, хто сказаў, што адраджэнне нацыянальнай мовы і культуры патрабуе разрыва сувязей з другімі нацыямі, нігілістычных адносін да іншых моў. Наадварот.

Сведчаннем гэтага можа быць суседняя нам Польшча. Там з сярэдзіны 80-х гадоў сапраўды панізілася колькасць студэнтаў, вывучаючых рускую мову. А ў апошнія гады сітуацыя змянілася такім чынам, што прыёмы на рускую філалогію нават праўзышлі паказчыкі канца 70-х — пачатку 80-х гадоў. Амаль ўдвая павялічвалася колькасць студэнтаў на кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. Успамінаю, з якой радасцю гаварыў мне яе загадчык прафесар Аляксандр Баршчэўскі: «Ведаеш, Сяргей, калі ў нас быў план, то мы бралі 12—15 студэнтаў, а ў бягучым годзе 27». І гэта натуральна.

* * *

Беларускаму народу, калі ён хоча адрадзіцца, неабходна ў самы кароткі тэрмін ліквідаваць нацыянальную непісьменнасць, вярнуцца да роднай мовы і нацыянальнай культуры, ад якіх ён ужо амаль тры стагоддзі так трагічна адарваны. Мы павінны навучыцца ад нашых суседзяў палякаў, рускіх, літоўцаў гарачай прывязанасці да роднай мовы, роднай культуры. Павінны, як і ўсе цывілізаваныя народы, развіваць пачуццё нацыянальнага гонару. Разам з гэтым не павінны ўпусціць таго шанцу, які даюць нам нацыянальныя рысы характару: нашая памяркоўнасць, нашая сціпласць і талерантнасць. Менавіта гэтыя рысы беларускага нацыянальнага характару дазваляюць нам паказаць прыклад сапраўды гуманных адносін да чужынцаў, у якім сіла падпарадкоўвалася б справядлівасці, а любоў і пашана да свайго народу не суседнічалі з пагардай да народаў іншых.

Як дамагацца і як дамагчыся гэтага? — вось пытанне, якое сёння паўстае перад кожным, хто хаця б чым-небудзь імкнецца дапамагчы нацыянальнаму адраджэнню.

**С. ГАБРУСЕВІЧ,**
**прафесар, старшыня Гродзенскай суполкі Беларускага фонду культуры.**

**(«Гродненская правда» за 17 лістапада 1992 г.).**

## *Выстава малюнкаў*

Незвычайная выстава адкрылася нядаўна ў галоўным корпусе універсітэта. На гэты раз на суд гледачоў прадставілі свае працы выхаванцы дзіцячай мастацкай школы г. Гродна.

Звыш 30 малюнкаў, лінаграфій, выкананых юнымі мастакамі, даюць нам магчымасць заглянуць у свет прыгажосці, пазнаёміцца з разнастайнымі густамі нашых дзяцей. Студэнты і супрацоўнікі універсітэта станоўча ацанілі многія карціны-нацюрморты аб краявідах роднай старонкі, лінаграфіі і інш.

**В. ВЕРАС.**

# Перамаглі гродзенцы

6—8 лістапада ў Лідзе праходзіла першынство рэспублікі па грэка-рымскай барацьбе сярод моладзі. Каманда г. Гродна, якая была ўкамплектавана ў асноўным студэнтамі універсітэта, заняла першае месца.

Пераможцамі сталі майстар спорту Юры Бадроў, студэнт 5 курса факультэта правазнаўства, Віталь Жук і Міхаіл Кароўкін — студэнты 1 курса факультэта фізічнай культуры.

Другое месца дасталося студэнту факультэта фізічнай культуры, майстру спорта Аляксандру Сідарэнку, трэцяе — Алегу Бандарэнку, трэцякурсніку факультэта правазнаўства.

* * *

З 23 па 25 кастрычніка ўпершыню ў нашым горадзе праходзіў міжнародны турнір на кубак Асацыяцыі студэнцкага спорту Рэспублікі Беларусь па грэка-рымскай барацьбе. У ім прынялі удзел каманды Грузіі, Расіі, Украіны, Польшчы, зборныя ВНУ Беларусі.

Уладальнікамі кубка ў камандным заліку стала зборная нашага універсітэта. На другім месцы каманда Беларускай акадэміі фізічнага выхавання і спорту, на трэцім — госці з г. Ванбжыха (Польшча).

Гродзенскія студэнты заваявалі 7 залатых узнагарод: Ігар Пеўцаў (48 кг.), Юры Храброў (62 кг.), Аляксандр Сідарэнка (82 кг.), Юры Бадроў (62 кг.) і Алег Бандарэнка (100 кг) — студэнты факультэта правазнаўства, Юры Бойка — загадчык лабараторыі інжынернага факультэта.

Сярэбраныя ўзнагароды дасталіся Юрыю Мірутэнку (74 кг.), Валерыю Віленцу (82 кг.), Станіславу Кавінкіну (62 кг.) з факультэта фізічнай культуры. Бронзавыя медалі атрымалі Уладзімір Сілаў (74 кг.) з гістарычнага факультэта і Міхаіл Кароўкін (82 кг.) з факультэта фізічнай культуры.

Фінальная частка турніру праходзіла на вялікай сцэне драмтэатра адначасова з выступленнямі артыстаў Беларускай філармоніі. Гэта было сапраўднае свята: спорт і мастацтва аб'ядналіся разам.

Віншаваць пераможцаў турніру прыйшлі першы прарэктар прафесар А. І. Васкабоеў, прарэктар па вучэбнай рабоце Я. А. Роўба, прафесар А. І. Яроцкі.

**І. БЕЛАВОКІ,**
**старшыня спартыўнага клуба.**

**На здымку: Юры Бадроў (справа) атакуе.**
**Фота У. САРОКІНА.**



# Раслінная касметыка

## *Для вас, дзяўчаты*

У касметычных мэтах — для догляду за скурай твару і рук, для змякчэння скуры, для паляпшэння росту і ўмацавання валасоў, для вывядзення бародавак і г. д.— здавён ужываліся самыя разнастайныя раслінныя сродкі. Прыводзім некаторыя з іх, найбольш распаўсюджаныя.

**АЛЕЙ** (ільняны, арэхавы, канапляны, бавоўняны, сланечнікавы). Гэта, відаць, самы распаўсюджаны сродак для змякчэння скуры, асабліва сухой. Для гэтага бяруць кроплю-другую алею і старанна расціраюць пальцы і кісці рук рукамі ўверх-уніз на працягу 15—20 мінут. Гэтак жа змякчаюць скуру твару, шыі.

**АЛТЭЯ ЛЕКАВАЯ.** У корані гэтай расліны ўтрымліваецца шмат вільгаці, якая робіць абвалакальнае і процізапаленчае дзеянне пры себарэйным дэрматыце твару і запаленчых вуграх. Для прыгатавання раствору корань алтэя здрабняюць і заліваюць халоднай вадой у суадносінах 1:10, г. зн. на 1 частку кораня бяруць 10 частак вады. Гэтая сумесь настойваецца прыкладна адну гадзіну, потым працэджваецца. Атрыманым настоем перыядычна мыюць твар.

**ШАЛФЕЙ ЛЕКАВЫ.** Лісце гэтай расліны выкарыстоўваюць для лячэння скуры з шырокімі порамі пры вугрыстай сыпі і себарэйным дэрматыце. Чайную лыжку здрабнёнага лісця заліваюць шклянкай кіпню і падаграваюць на слабым агні 3—5 хвілін. Цёплы раствор выкарыстоўваюць для прымочак.

**КАЛЕНДУЛА (НАГОТКІ).** У яе кветках ёсць саліцылавая, яблычная кіслоты, каранцін (правітамін А), календулін, фітанцыды. Настойка на 40-працэнтным спірце (прасцей кажучы, на звычайнай гарэлцы) у суадносінах 1:10 заспакойвае раздражненне скуры і дзяснаў, ужываецца пры выпадзенні валасоў і тлустай себарэі. Для ўцірання ў скуру і прымочак чайную лыжку настойкі раствараюць у шклянцы вады.

**БУЛЬБА.** Сокам свежай бульбы лечаць экземы, апекі, мазалі, трафічныя язвы, дэрматыты. Ачышчаную бульбу здрабняюць на дробнай тарцы. Атрыманую масу кладуць у складзеную ў некалькі слаёў марлю і прыбінтоўваюць да пашкоджанага ўчастка скуры. Праз некалькі гадзін бульбяную масу асцярожна здымаюць.

**СВЯТАЯННІК.** У ім утрымліваецца да 10 працэнтаў дубільных рэчываў, вітаміны PP і C, правітамін А, азулен. Гэтая расліна мае дэзінфіцыруючыя і вяжучыя ўласцівасці. Настой у суадносінах 1:5 аказвае лекавы эфект пры вугрыстай сыпі, заспакойвае раздражненне скуры, садзейнічае загойванню пры гнойных запаленчых працэсах скуры.

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы ў месяц
Аб'ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 15.00.

Наклад 2.000 экз. Зак. 4774

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

*В. а. рэдактара*
*У. П. АМЕЛЬКА*